Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Наша Праўда

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адмініс… Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wi… Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз… апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 …	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата напрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 33 Вільня, Серада 27-га ліпня 1927 г. Год I

Што паказуюць выбары?

Разгром польскім урадам арганізацыі „Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады" ў першы мамэнт нязвычайна ўсьцешыў усе тыя дробныя палітычныя групкі з буржуазнай ідэалёгіяй, якія раней з жахам сачылі за стыхійным ростам „Грамады". І Павлюкевічавы „нацыяналісты" (з „истинно-русским" душком), і „хадэкі" кс. Станкевіча, і Ярэмічавы „сельсаюзьнікі" — ўсе гэтыя „крамкі" і „гандэлькі", пабудаваныя на нясьведамасьці цямнейшых элемэнтаў вёскі або на прадажнасьці здраднікаў яе, бачылі ў *масавай арганізацыі сялян і работнікаў* Заходняе Беларусі немінучую ўжо *сьмерць* для сябе. І вось раптам пагроза гэтая, здавалася, счэзла, разьвеялася, быццам дым. Больш таго: „павадыры" ці „ўласьнікі" гэных „крамак" і „гандэлькаў" думалі навет, што — пасьля ўдараў ураду „па галовам" масавага руху (паводле рэцэпту Ярэміча!)—маса пакорна пойдзе за тымі палітычнымі арганізацыямі, якіх урад, бачучы іх карыснасьць для сябе, *не чапіў.*

Але радасьць прадстаўнікоў варожае масам буржуазнае ідэалёгіі была нядоўгая. Хоць і пазбаўленыя „галоў", беларускія працоўныя масы не пайшлі, аднак, ні за Павлюкевічам, ні за кс. Станкевічам, ні за ягонымі падгалоскамі — Ярэмічамі ды Рагулямі. Навет найбольш „радыкальны" з іх (ведама, на словах!) пасол Рагуля, які пробаваў падмалявацца пад „грамадаўца" і ткнуцца ў вёску ў сваім павеце, сустрэў тамака такі прыём, які адбіў у яго ахвоту далей цягацца па краю і заманіваць людзей у „Сельсаюз"...

Чаму-ж гэта?

А затым, што ў нашай вёсцы адбыўся глыбокі *ідэйны пералом.* Вёска, у якой нязвычайна вырасла палітычная і сацыяльная сьвядомасьць, зразумела і глыбока пранялася тэй думкай, што ані беларускае нацыянальнае адраджэньне, ані палітычнае і сацыяльнае вызваленьне нашага працоўнага народу—немагчымы датуль, дакуль *сама маса* не пачне жыць сьвядомым жыцьцём, не пачне сваімі рукамі будаваць сваей будучыны. Вёска пераканалася, што пад панаваньнем буржуазіі, да таго-ж чужое нам нацыянальна, ня можа быць зьдзейсьнены ніводзін з нашых нацыянальных і сацыяльных ідэалаў, што і беларускае пытаньне наагул—у шырокім разуменьні — ня вырашыцца датуль, дакуль *клясавае змаганьне* ня дасьць *перамогі працоўным.*— Вось чаму нашае працоўнае сялянства ня йдзе і ня пойдзе за ўсімі тымі палітычнымі групамі ці партыямі, якія хочуць выступаць *за масу* і *ад яе імя* вядуць недастойныя палітычныя спэкуляцыі з краёвай ці замежнай буржуазіяй, сьвядома пакідаючы масу ў стане *распыленасьці і дэзарганізацыі.* Вось чаму ўсе гэныя „Сял. Нівы", „Крыніцы" і „Словы", ня маючы магчымасьці крытыкаваць і разьбіваць тую ідэалёгію, якая сяньня зьяўляецца *пануючай* у нашай вёсцы, з дзікай ненавісьцяй накідаюцца па тварцоў гэтае ідэалёгіі, дарэмна спадзяючыся, што кіданымі на іх брудамі здолеюць забрудзіць і той сьцяг, пад якім ідуць масы.

Вынікі выбараў у вясковыя і мястовыя самаўрады, якія ўжо ў Заходняй Беларусі падыходзяць да канца, найлепш выяўляюць настроі нашых масаў: яны пацьвярджаюць усё тое, што мы тутака аб іх сказалі. Але вынікі выбараў гавораць яшчэ аб нечым, што мае для нашага грамадзкага жыцьця вялізарнае практычнае значэньне: яны гавораць, што наша *працоўная ідэалёгія* ёсьць ідэалёгія ня толькі барацьбяная, але й *творчая,* бо-ж іменна пранікненыя ею элемэнты вёскі беларускай ідуць на творчую гаспадарчую работу ў самаўрадах і, як элемэнты інтэлектуальна й маральна найвышэйшыя, мусяць заняць тамака *кіраўнічае месца.*

Не дарма-ж Павлюкевічавае „Слова" і ягоны „Самаўрадавы Камітэт" ужо распачалі проці нашых новых радных адкрыты паход, карыстаючыся звычайнымі ў падобных „дзеячоў" спосабамі барацьбы: ілжывымі даносамі і абвіненьнямі ў „камунізьме"...

„Доктар" Павлюкевіч, паварыр „дэфэнзыўных нацыяналістаў" з „истинно-русским духом" (тыпу Кавэрды), у № 24 „Беларускага Слова" абвяшчае сябе ня больш і ня менш, як... „беларускім Пілсудскім"! Ну, ды гэта ягоная і пана Пілсудскага асабістая справа: хто з іх на каго мае абразіцца за гэнае прыраўнаньне. Нас цікавіць у гэтым выступленьні „доктара" адно тое, што, абабраўшыся за „Пілсудскага", ён мэтадамі пана Маршалка маніцца загнаць... у сваю „партыю" ўсіх беларускіх самаўрадавых дзеячоў, выбіраных у вясковыя рады. З гэтай мэтай „доктар" сфабрыкаваў нейкі свой „Беларускі Камітэт па справам самаўрадаў" і заклікае ўсіх новых радных-беларусаў трымаць з ім „цесную сувязь".

Якія вынікі гэнае „сувязі", сьведчыць "Камунікат" гэнага „Камітэту", надрукаваны ў тым жа № 24 „Бел. Слова". Там зьмешчаны ня больш і ня менш, як данос на новаабраных радных у Слонімшчыне, быццам усе тыя з іх, якія ня трымаюць „цеснае сувязі" з „доктарам" і ягонымі арганізацыямі", зьяўляюцца... **сябрамі Камуністычнае Партыі Заходняе Беларусі!**

Хіба-ж няма патрэбы тлумачыць, што шляхам абвіненьня ў камунізьме і пагрозай вастрогу за нібы-то прыналежнасьць да КПЗБ „доктар" маніцца загнаць у сваю крамку маласьведамых радных-сялян. Але-ж **чэсныя** беларускія барацьбіты і культурныя працаўнікі такога роду „бата" не баяцца і на агідную ролю супрацоўнікаў „доктара" ня пойдуць!

Ці-ж—канец хатняй вайны у Кітаі.

Рэзкі паварот фронту Чанг-Кай-Шэка,— які замест Пэкіну з Чанг-Тсо-Лінам — стаў біць Ханькоў дый біць сваіх чырвоных саюзьнікаў, аказаўся невыпадковым. Як пішуць з трыумфам англійскія газэты, Чанг-Кай-Шэк заключыў дагавор з Чанг-Тсо-Лінам—аб поўным спыненьні ваеннай акцыі з ім. Гэтым тлумачыцца тое, што Чанг-Кай-Шэк зусім неспадзявана павярнуў фронт сваей арміі проці Ханькоў, узяў яго ў некалькі дзён, адначасна выклікаўшы — шляхам подкупу— бунт аднаго з важнейшых генералаў ханькоўскай арміі. Частка ханькоўскіх войскаў адыйшла з Ханькоў ды злучылася з арміяй ген. Фэнга. Аб тым, што робіць гэты галоўны камандзір усіх чырвоных войскаў, вестак няма.

Гэткім чынам, трэба прызнаць, што пакуль-што ваенная сіла левага крыла Куо-Мін-Тангу, — душы вызваленчага сацыяльна нацыянальнага руху ў Кітаі — зламана... У апошні мамэнт, ужо зусім перад поўнай перамогай сваей над Чанг-Тсо-Лінам—Чанг-Кай-Шэк — выбраў прыяцелем яго, а свайго саюзьніка — дабіў... У выніку трактату з Чанг-Тсо-Лінам Чанг-Кай Шэк мае артымаць галоўнае камандаваньне над усімі ваеннымі сіламі Кітаю — паўдзённага і паўночнага. Гэта значыць перадусім, што Кітай быццам ізноў злучаецца ў нешта адзінае, пакуль-што яшчэ без дакладна апрацаванай формы... А другое, гэта — тое, што Чанг-Тсо-Лін быццам прызнае над сабой уладу Чанг-Кай Шэка.. Абодва павадыры гэткім чынам злучаюць сваі сілы дый, як цьвердзіць захопленая рэзультатам англійская прэса, — дзеля сьмяротнай барацьбы проці — „камуністычнага руху" ў Кітаі... Гэткім чынам, у кожным разе трэба сцьвярдзіць пакуль-што — поўны трыумф контр рэвалюцыйнай акцыі ў Кітаі. Перамагла ізноў кітайская буржуазія, якая апанавала рэвалюцыйны народны рух, злучаўшы імкненьні сацыяльнага і нацыянальнага вызваленьня.

Чаму гэта здарылася, ясна — з усяго ходу кітайскіх падзей. Разгледзім толькі два найбольш драматычныя мамэнты ў кітайскай вызваленчай барацьбе — мамэнты перамогі і трыумфу рэвалюцыйных народных арміяў проці ворагаў народнага вызваленьня. Першы мамэнт — бліскучая перамога пад Шанхаем, калі народная армія лёгка справілася з усімі краёвымі, варожымі ей, сіламі, навет узброенымі чужаземнымі імпэрыялістамі, але раптам уперлася — у новага ворага: узброеную да зубоў марскую і сухапутную сілу злучанага міжнароднага імпэрыялізму, на чале з Англіяй... Перад устаўшай новай небясьпекай, новай барацьбой з новым магутным праціўнікам — слабадушны, малаверны павадыр народных арміяў Чанг-Кай-Шэк спалохаўся і адступіў... Ен яўна здрадзіў народны рух, можа, прадаўшыся англійцам за юдавы срыбнікі... Здрадзіў і пачаў біць свайго-ж магутнага саюзьніка — працоўныя масы народу, які пэўна-ж даў-бы яму поўную перамогу да канца і над гэтымі злучанымі імпэрыялістамі ўсяго сьвету...

Другі мамэнт — сучасны, — новы паварот таго-ж Чанг-Кай-Шэка, новая здрада і новая капітуляцыя, цяпер ужо ня перад Англіяй, але — перад Японіяй... Як пасьля перамогі пад Шанхаем, раптам вырас новы вораг — Англія, так цяпер, пасьля амаль ня поўнай ужо перамогі над Чанг-Тсо-Лінам перад Чанг-Кай Шэкам адчынілася пагроза новай вайны — з Японіяй... І гэтай вайны з тэй жа злучанай арміяй міжнароднага імпэрыялізму, на чале з Японіяй, таксама спалохаўся маладушны ды слабаверны Чанг-Кай-Шэк... Спалохаўся і пайшоў на кампраміс з наймітам апошняй — Чанг-Тсо-Лінам...

Гэткім чынам, праўду кажучы, — пад Шанхаем перамагла Англія, пад Пэкінам, які быў ужо амаль ня ў руках Чанг-Кай-Шэка, — перамагла Японія... Гэта значыць, што кітайскі рэвалюцыйна-вызваленчы рух зламаны зусім ня ўласнымі сіламі краёвай буржуазіі, як пішуць англійскія ды японскія газэты, але выключна — сіламі міжнароднага імпэрыялізму... І Чанг-Кай-Шэку, які пайшоў на тое, каб стаць прыладай гэтага, прынцыповага варожага жыцьцю ды самастойнасьці кітайскага народу імпэрыялістычнага жываеда, хутка прыйдзецца пачуць на сваей „адзінай у аб'яднаным Кітаі уладзе"— увесь цяжар яго жалезнай лапы...

Бясспрэчна рашучым чыньнікам паражэньня кітайскага вызваленчага руху зьявілася — аб'яднаньне сілаў дзьвюх найбольш заінтэрэсаваных у Кітаі жываедаў — Англіі і Японіі. Толькі што якраз і адбылося гэтае новае паразуменьне, амаль не ўзнаўленьне старога даўгагадовага саюзу англійска-японскага. І вось, вынікі гэтага паразуменьня ўсім цяжарам спалі на вызваленчую барацьбу кітайскага народу... З усяго вышэйсказанага ясна, што — у рэзультаце перамогі Англіі і Японіі ў Кітаі, — першай пад Шанхаем, другой — пад Пэкінам ці Мугдэнам, — „адзіны, непадзельны самастойны Кітай", створаны супольнымі сіламі абодвух Чангаў — абодвух наймітаў: англійскага і японскага,—узапраўднасьці будзе ізноў, як даўней, падзелены на дзьве паловы — паўдзённую, дзе будзе панаваць „уплыў", ці прасьцей: падкуп ды вызыск Англіі, і — паўночную, дзе будзе гуляць па кітайскіх галавах браніраваны кулак Японіі. А гэта ўсё разам пэўна ж атрымае які-небудзь харошы ды гучны назоў — „незалежнай, адзінай ды непадзельнай Кітайскай Рэспублікі", ці штосьці — у гэтым родзе...

Вучэцеся народы, якія вызваляецеся — з прыкладу сваіх братоў, абдураных прадажнымі ды маладушнымі павадырамі...

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Апазыцыя пэпэзсаў непакоіць урад...

Паўурадавы „Кур. Поранны" страшэнна абураны на пэпэзсаў за тое, што яны—„падважваюць аўтарытэт ураду", — адзіны аўтарытэт, які астаўся ў Польшчы, — пасьля таго—дадамо, як... урад, на чале з марш. Пілсудскім аканчальна падкапаў аўтарытэт польскага парляманту... Газэта відзіць у гэтым— „паважную небясьпеку для Польскае Дзяржавы наагул".

„Роботнік" слушна адказвае на гэта, што павага ўраду ў дэмакратыі зьяўляецца толькі простым вынікам павагі Парляманту, які выражае волю краю, якую ўрад мае толькі спаўняць... Дык калі паны пілсудчыкі-санатары, на чале з сваім павадыром, зламалі ды зьнішчылі павагу польскага Парляманту ды Канстытуцыі, дык тым самым нясумерна больш пашкодзілі Польскай Дзяржаве, як хто іншы... „Падрэзалі карэньні— дык захісталася і дрэва"...

Толькі цяпер піша „Роботнік" аб тым, што—„пасьля перавароту, а асабліва пасьля падзеньня ўраду Бартля, які яшчэ сяк-так дзяржаўся нейкіх формаў прыстойнасьці, наступіла тактыка ўраду (прапушчаны словы: марш. Пілсудскага...), якая зруйнавала дый ашэльмавала наагул ідэю народнага прадстаўніцтва"...

„Не забывайцеся, піша „Роботнік", што мы жывём у пераходным мамэньце. Проці дыктатуры фашыстаў ці камуністаў можа адратаваць толькі грэбля—парлямантарнай дэмакратыі... Калі вы (санатары пілсудчыкі) яе зруйнуеце, тады перад работніцкай клясай стане трагічнае пытаньне: каторую дыктатуру выбраць"... — „І дзеля таго нашы дарогі разыйшліся"...

Усё гэта слушна. Толькі дарэмна „Роботнік" думае, што гэтае запраўды ж „трагічнае для—пэпэзсаў пытаньне: якую дыктатуру выбраць: фашыстаўскую ці камуністычную, можа быць наагул нейкім „пытаньнем" для работніцкай клясы... Гэта-ж паны пэпэзсы дагэтуль паддзержвалі істнуючы ў нас парадак, даводзячы на ўсіх кангрэсах у Эўропе, што ніякай дыктатуры ў Польшчы, дый ніякага фашызму ў ей няма... „Круты-круты, та не перакручывай", кажуць украінцы. Бедным пэпэзсам іх „апазыцыя" — пэўна-ж няменш прычыняе „трагізму", як ураду марш. Пілсудскага...

„Падстава ўраду" ў местах краю.

Цікаўныя лічбы выбраных радных у мястовыя самаўрады ў ваяводзтвах: Варшаўскім, Лодзінскім, Келецкім, Люблінскім, Беластоцкім, Валынскім ды Віленскім — паказваюць запраўды-ж дзіўную „падставу" істнуючага ўраду марш. Пілсудскага, аб папулярнасьці якога так гучна пішуць казённыя газэты. Як падлічыў „Работнік", — на ўсю лічбу 1597 радных радавыя групы, залічаючы і віленскіх манархістаў (якія галасавалі ў Вільні—за эндэка Банькоўскага....),—здабылі ўсяго толькі 90 мандатаў. Гэта-ж толькі — крыху больш 5 проц. І трэба памятаць, што ўрадавыя групы мелі „магчымасьць" (грашовую...) вясьці такую выбарную агітацыю, як ніводная іншая. Дык цяпер ясна, чаму папулярны ў Польшчы ўрад марш. Пілсудскага так баіцца рабіць новыя выбары ў Сойм.

Апазыцыйны — „Роботнік" радзіць навет ураду— „зрабіць згары ўсе вывады з гэткага паражэньня на выбарах у самаўрады, ці — прасьцей кажучы: выйсьці ў адстаўку.

Чуткі аб зьменах у ўрадзе.

„Газэта Варшаўска Поранна" (эндэцыя) і іншыя газэты пішуць аб нейкіх плянах, што да пераменаў у складзе ўраду. Але самы міністры ня ведаюць нічога дакладнага аб плянах прэм'ера Пілсудскага.— Бо ён сядзіць сабе, запершыся, дый навет не дапускае да сябе саміх міністраў. Кажуць паважна аб зьмене на становішчы мін. ўнутраных спраў. Быццам ген. Складкоўскі выйдзе ў адстаўку.

„Польска Збройна" напісала навет, што на яго мейсца мае быць назначана мін. пошты Медзіньскі, проці якога абурана ўсе польскае грамадзянства, але якога, наадварот,—вельмі любіць марш. Пілсудскі.

Непакоіць быццам страшэнна (...) ўрад, а перадусім асабіста марш. Пілсудскага, — „вострая апазыцыя" з боку пэпэзсаў.— З аднаго боку, заварушыўся на сваім цёпленькім міністэрскім крэсьле сам „таварыш Марачэўскі", які зразумеў, што трэба ўжо выбраць нарэшце—ці яму аставацца міністрам

ураду Пілсудскага, ці аставацца ў ППС... Быццам хоча побач з Марачэўскім выйсьці ў адстаўку і другі міністар — пэпэзсавец п. Юркевіч. Гэтыя міністры, дадаюць газэты, рады былі-б астацца ў складзе ўраду, але проці іх страшэнна выступілі „манархічная правіца" ўраду Пілсудскага — міністры Мэйштовіч і Незабытоўскі, якія пагражаюць самі адстаўкай, калі ня будуць выкінуты з ураду—„небясьпечныя сацыялісты" Марачэўскі ды Юркевіч... Кажуць таксама аб адстаўцы мін. Чэховіча (скарбу)—якога вінавацяць у няўдачы пазыкі, і — мін. Залескага, які ўсьцяж хварэе...

На другі дзень паўафіцыяльна ўсе гэтыя чуткі былі запярэчаны. Але, ведама, што гэткае „афіцыяльнае запярэчаньне" амаль не заўсёды толькі пацьвярджае іх.

Міністар Ромоцкі перапрасіў дэлегацыю чыгуншчыкаў.

Пэпэзсаўскі „Роботнік" трыумфуе: Міністар Ромоцкі спалохаўся пагрозы... агульнай забастоўкі чыгуншчыкаў дый перапрасіў пэпэзсаўца Курыловіча за абразу...

22 ліпня міністар запрасіў да сябе ізноў тую самую дэлегацыю, якую ён—у асобе яе павадыра пасла Курыловіча — так нявятліва патрактатаваў 15 ліпня, ды заявіў ей, што выпадак, які меў тады месца, выкліканы непаразуменьнем. Дык хай будзе так, быццам яго зусім ня было—бо міністар не жадаў зусім абразіць пасла Курыловіча... Пасьля пачалася канфэрэнцыя ў справе падвышак да пэнсіяў чыгуншчыкам. Пасьля канфэрэнцыі ўвесь выпадак пастанавілі лічыць зьліквідаваным. — Пэпэзсы ізноў памірыліся з п. міністрам...

Але і пасьля „зьліквідаваньня" „Роботнік" усьцяж зьмяшчае пратэст розных саюзаў — чыгуншчыкаў, урадоўцаў ды іншых. Трэба ж чым-небудзь заняць увагу работнікаў—хаця гэткай „апазіцыяй"...

Пасол Патэк выехаў у Маскву.

23-га ліпня польскі пасол Патэк выехаў у Маскву. Доўга нараджаўся пасол з кіраўнікамі польскай палітыкі ў справе пастаўленых на чаргу дня радавым урадам пытаньняў — перадусім у справе гаранцыйнага пакту... Як ведама, Рады даўно ўжо прапануюць Польшчы заключыць гэткі трактат, які-б гарантаваў абодва краі ад вайны між сабой. Але неяк дагэтуль усё польскі бок адцягвае справу... Лёгка зразумець, як цяжка запраўды-ж для польскага ўраду — рашуча выбраць між... Англіяй і С. С. Р. Р... Бо-ж — ні для каго ня сэкрэт, што Англія зацікаўлена Польшчай галоўным чынам, як „авангардам проціредавага фронту" — на выпадак вайны з ССРР, аб якой — як у гарачцы — лятуціць п. Чэмбэрлен... Дый дзеля таго-ж, а не дзеля чаго іншага, гэты Чэмбэрлен вырабляе для Польшчы розныя карысныя рэчы, як пазыку і інш. Падпісаўшы гаранцыйны (проці ўзаемнай вайны) пакт з ССРР, Польшча адразу страціла б гэткую высокую ды карысную для яе апеку ды ахову. Дык ясна ж, што паслу Патку прышлося шмат папрацаваць у Варшаве з камандзірам польскай палітыкі... Толькі вось — ці што выйшла з гэтай працы, няведама...

Пасол Патэк у гутарцы з журналістамі перад выездам у Маскву казаў розныя харошыя рэчы, выразіў добрыя надзеі ды пажаданьні, але аб тым, ці ён павязе ў Маскву нешта канкрэтнае, не сказаў ні слова. Ен казаў быццам, што вязе з сабой ды ўручыць асабіста ўраду — польскі адказ на другую ноту Радаў у справе забойства Войкова, якой чакае радавы ўрад ужо каля месяца... Але, калі ён паехаў, дык газэты паведамілі, што адказ будзе высланы толькі ў канцы тыдня... Дык — за свой даўжэнны пабыт у Варшаве пас. Патэк ня здолеў навет разам з мін. Залескім апрацаваць гэтага адказу...

Вярнуўся на належнае месца.

Пасол Вітас выбраны ізноў на становішча войта Верхаславіцкай гміны, дзе ён быў войтам — у пачатку сваей дзіўнай палітычнай кар'еры, дзеля якой ён ня мае — абсалютна ніякіх зразумелых даных.. Толькі ў Польшчы мог гэткі „палітык" некалькі разоў, як старшыня ураду, будучы ўзапраўднасьці толькі вывескай (шыльдам ды шырмай) дзеля польскага сялянства, за якой абшарнікі рабілі сабе сваё — ратуючы за ўся лякую цану свае двары ад зямельнай рэформы... Так было ў Польшчы ў першыя часы — „за Начальніка Дзяржавы Пілсудскага" — у часы „панаваньня ў Польшчы дэмакратыі"...

Пасьля, калі гэтая „дэмакратыя" радыкальных сынкоў польскіх абшарнікаў ужо адратавала бацькоўскія двары ад „люду", тады Вітас скінуў „радыкальную скуру" ды адкрыта перайшоў на бок абшарніцка-капіталістычнай Хіены, прадаўшы ўсю сваю партыю Пяста...

Нешта падобнае робіцца на нашых вачох і з іншымі павадырамі польскай дэмакратыі...

Вярнуўся ў Варшаву англійскі пасол Мюльлер.

У Варшаву вярнуўся з водпуску англійскі пасол Макс Мюльлер. Як ведама, англійскі пасол выехаў у водпуск — на другі дзень пасьля забойства пасла Войкова.

Арыштаваньне камуністаў у Варшаве.

У Варшаве 22 ліпня арыштавана 18 асоб, быццам выдатных дзеячоў Камуністычнай Партыі Польшчы і сяброў Цэнтральнага Каміт. Кам. Партыі Заходн. Украіны. Паміж імі і рэдактара часопісі „Націо" — Кароля Арыо. „Роботнік", падаючы гэтую вестку, піша, быццам гэтымі арыштамі канчальна зьліквідаваны Ц. К. украінскіх камуністаў, які нядаўна выпусьціў адозвы, заклікаючы да барацьбы з польскай акупацыяй Заходн. Украіны дый да адарваньня Усходн. Галічыны, каб далучыць яе да Радавай Украіны.

Арыштавана быццам і прыехаўшых з-заграніцы камуністаў, пры вобыску ў якіх знойдзена шмат даляраў ды гданскіх гульдэнаў. Весткі пакідаем на адказнасьці „Роботніка".

Узрост камунізму ў Польшчы.

„Роботнік" сцьвярджае, што ў Польшчы ў грамадзянстве, а перадусім сярод работніцкіх масаў—усьцяж узрастаюць уплывы камуністаў, ці—„камуністычныя настроі"... У гэтым факце газэта ППС відзіць выраз стыхійнага нездаволеньня ў краі ўрадавай палітыкай...

Вобыск у рэдакцыі „Націо".

У рэдакцыі месячніх „Націо", органу блёку нацыянальных меншасьцяў у Польшчы паліцыя зрабіла вобыск. Арыштаваны нейкі Арыо.

Эндэцкая прэса ўжо трыўмфавала, падлічаючы ўсе прадступленьні часопісі, якая, напрыклад, налічыла столькі меншасьцяў у Польшчы, што палякаў у ей, выходзіць, быццам зусім няма... Як мы ў свой час адзначалі, гэта знак толькі слабай граматнасьці паноў аўтараў ды рэдактараў часопісі, у якой, напрыклад, беларуская „навука" прадстаўлена п. Ярэмічам...

Але пасьля аказалася, як паведамілі газэты, быццам вобыск зроблены ў рэдакцыі „памылкова"...—Выйшла ўсё зусім — „выпадкова" вобыск рабіўся ў кватэры „камуніста" нейкага Арыо побач з рэдакцыяй—дык ці-ж маглі „ўлады бясьпечнасьці" адмовіцца ад спакусы — выкарыстаць шчасьлівы выпадак дый зірнуць у пакоі рэдакцыі, ці няма і там чаго цікаўнага... Ну, ведама ж,—„памылка"... перапрасілі можа яшчэ, дык ужо—няма чаго.

„Яго Блаженство Блаженнѣйшій Дзяніс".

Толькі-што ўласны орган варшаўскага мітрапаліта Дзяніса „Воскрэсное Чтеніе" — такім высокім штылем апісваў праезд „уладыкі" па Валыншчыне. Загаловак артыкулу нанятага пісакі быў такі: „Посѣщеніе Его Блаженствомъ, Блаженнѣйшимъ Владыкой Митрополитомъ Діонисіемъ Волыни". А вось, як апісаў газэтны „служка" варшаўскага мітрапаліта ноч, у якую той... спаў сябе ў Крамянцы. „Настала ноч. Ярка гарэлі на небе зоркі. Лагодна, кезямнымі вачыма глядзелі яны на грэшную зямлю. Іх ціхія калыхаючыя праменьні быццам віталі места Крамянец, шэпчучы: Якія вы шчасьлівы крамянчукі:—сярод вас цяпер знаходзіцца Уладыка Мітрапаліт, ён цяпер пачывае. Дык сьпеце спакойна і вы". Бачыце, простыя людзі „сьпяць", а вышэйшыя — рознае начальства — „пачывае". І гэтая лёкайская „літэратура" друкуецца на грошы, якія бяруцца з галоднага народу. А найцікаўней, што галоўным рэдактарам гэтага „духоўнага журналу" зьяўляецца сам мітрапаліт Дзяніс, які гэткім чынам — сам сябе называе „Яго блажэннейшым, Блажэнствам" і піша сам пра сябе, як ён „пачываў" у Крамянцы, як аб гэтым „шапталі зоркі на небе" і таму падобную дурную, дрэнную ды шкодную—бо запраўды ж—багахульную хлусьню.

„Дзяніс Благословенный".

Польскія газэты пасьпяшылі паведаміць аб тым, што „сусьветны" патрыярх Васіль — з прычыны візыты ў гэтага патрыярха мітр. Дзяніса выдаў апошняму грамату, якая надае яму „тытул Благословеннага". Адгэтуль— ня толькі мітр. Дзяніс асабіста, але і ўсе наступныя варшаўскія мітрапаліты „аўтакефальнай праваслаўнай царквы" ў Польшчы будуць называцца „Благословенными".

Калісьці „расейскі народ" даў гэткі тытул „Благословеннаго" цару Аляксанду І—за тое, што той — на чале паўстаўшага народу вызваліў край ад чужаземнае навалы, выгнаўшы з сваіх межаў Напалеона. А цяпер варшаўскі „ўладыка" дастаў той-жа тытул— праўду кажучы,—значна танней.

Дапамога Наваградчыне.

Рада міністраў мела ў панядзелак вырашыць справу дапамогі 5 пацярпеўшым ад урагану паветам Наваградчыны. Быццам міністэрства ўнутраных спраў мае асыгнаваць на гэта 600 тыс., мін. працы і сацыяльнай аховы — 1 мільён, мін. асьветы — 50 тыс.

Заграніцай.

Востры дыпляматычны канфлікт між Нямеччынай і Бэльгіяй.

Цікаўны вельмі для „Вэрсальскай Эўропы" канфлікт выбухнуў раптам між нямецкім і бэльгійскім урадам.

Як ведама, увесь будынак „Вэрсальскай Эўропы" пабудаваны на — „вечнай няволі разброенай Нямеччыны—пад жалезным ботам саюзьнікаў"...

Што гэткі недарэчны парадак рэчаў ня можа доўга істнаваць, у гэтым цяпер ужо не сумляваюцца навет самыя зацятыя „немцаеды-пераможцы"... Пад націскам ня толькі ўзростай у сваей гаспадарчай і ўсялякай сіле Нямеччыны, але і—агульнага гаспадарчага адраджэньня сьвету, ня толькі Амэрыка, Англія і шмат нэйтральных дзяржаваў, але навет сама Францыя—пачалі „дапускаць да жыцьця" і да сваей кампаніі Нямеччыну... „Непахільны Вэрсальскі Трактат" паволі сам сабой развальваецца ў груз. Нямеччына займае належнае ёй „мейсца пад сонцам" — сама працай бяручы сабе тое, чаго ня хочуць даць ей былыя пераможцы. Цяпер, як ні круцяць саюзьнікі, мусяць скасаваць акупацыю нямецкай зямлі, на якой яшчэ стаяць, дражнючы нямецкі народ,—каля 70 тысяч чужаземных жаўняроў. Трэба зьвяць іх—бо-ж толькі, што саюзьнікі афіцыяльна прызналі, што Нямеччына выпаўніла ўсе прынятыя на сябе абавязкі поўнага разбраеньня...

І вось, назаўтра пасьля гэтага афіцыяльнага прызнаньня, як маланка сярод яснага неба, стрэліла прамова бэльгійскага ваеннага міністра—аб бязупынным узросьце нямецкіх збраеньняў, аб тайным падрыхтаваньні Нямеччынай новай вайны...

Ня можа быць сумліву ў тым, што гэты правакацыйны напад на Нямеччыну з боку Бэльгіі зроблены ў паразуменьні з францускім урадам Пуанкарэ, які змушаны—пад націскам Нямеччыны, Амэрыкі і Англіі—скасаваць акупацыю, але які ні за што ня хоча зрабіць гэта, выпусьціўшы ўжо раз назаўсё ды ўсялякую ўладу над Нямеччынай...

На прамову бэльгійскага міністра вельмі востра зарэагавала Нямеччына. Нямецкі пасол патрэбаваў, каб бэльгійскі міністар паказаў яму тыя дакуманты, на якія пазываўся ён у парляманьце, сцьвярджаючы нямецкія збраеньні. І вось, найбольш цікаўна, што ваенны міністар Бэльгіі адмовіўся навет сказаць, якія гэта дакумэнты, сцьвярдзіўшы толькі, што яны запраўды здабыты шляхам ваеннага шпіянажу Бэльгіі ў Нямеччыне... Цікаўныя, запраўды-ж, звычаі ў паноў буржуазных міністраў: лаюць яны страшэнна, зрываючы навет дыпляматычныя стасункі, радавы ўрад — за тое, быццам той насылае сваіх агентаў у-ва ўсе дзяржавы—дзеля ваеннага шпіянажу, але самы яны робяць тое-ж, можа толькі крыху бясьпечней — бо-ж іх агентаў ніхто не абвясьціў „па-за правам", як камуністаў.. Бэльгійскі міністар заявіў, што не пакажа гэтых „дакумэнтаў", але — што ён пераканаы ў тым, што яны — пэўныя...

На гэта нямецкі ўрад мог толькі заявіць вельмі востра, што гэтыя „дакуманты", зьмест якіх ня можа быць навет раскрыты ў дыпляматычнай перапісцы, ня могуць быць падставай для такога паважнага абвінавачаньня. Дык з апошнім папросту ня трэба лічыцца па сутнасьці. А вось палітычны зьмест усей кампаніі з боку Бэльгіі — зусім ясны: адна з дзяржаваў, падпісаўшых лёкарнскія трактаты, ясна адыходзіць ад палітыкі паразуменьня з Нямеччынай, якая толькі-што афіцыяльна ўсімі саюзьнікамі, у тым ліку і Бэльгіяй, прызнана споўніўшай усе варункі разбраеньня, прадугледжаныя Вэрсальскім Трактатам...

Гэткім чынам, бэльгійскі напад на Нямеччыну скончыўся толькі скандалам. Але з гэтага выпадку—ясна, як цяжка будзе Нямеччыне скінуць з сябе чужаземную акупацыю—ня гледзячы на ўсю яе недарэчнасьць, шкоднасьць і небясьпеку для міру...

Нямецка-бэльгійскі канфлікт у Радзе Лігі Народаў.

Канфікт між нямецкім і бэльгійскім урадам — у справе абвінаваньняў бэльгійскім ваенным міністрам Нямеччыны ў незаконных збраеньнях—мае, як цьвердзіць англійская прэса, пайсьці на разгляд Рады Лігі Народаў.

Ляо-Дзэ.

На вуліцах Шанхаю.

(Абразкі з сучасных кітайскіх падзеяў).

Грозна нашэрсьціўшыся штыкамі, чацьвёрка за чацьверкай пасьпешным шагам ішоў крывымі вуліцамі кітайскага Шанхаю ўперад батальён апранутага і ўзброенага на японскі манер войска. Скуластыя твары салдат былі смутны і пануры, вочы здраджалі якіясьці думкі, пытаньні і скрытае ўнутранае змаганьне пачуцьця абавязку з мусам.

— „Куды і пашто нас вядуць?" здавалася чуліся пытаньні з твараў і рухаў салдат.

Пытаньне было простае, але даць на яго адказ было досыць трудна. Кірунак дарогі быў салдатам нязнаны, мэта паходу і яго заданьні былі ведамы толькі афіцэрам, і ад салдат трымаліся ў сэкрэце, аб іх яны маглі толькі дагадвацца.

Забараніць дагадвацца ніхто нікому ня можа. Ідучы пасьпешна ўперад, салдаты дагадваліся, куды іх вядуць і іх твары станавіліся ўсё болей і болей панурыя, усё болей і болей смутныя.

— „Ці-ж бы нас вялі на забастоўшчыкаў?"—думаў тонкі худашчавы Кай-Ю-Сянг салдат з першага раду, які тры дні таму-назад першы прынёс у казарму вестку аб забастоўцы.

— „А калі ды нас вядуць на забастоўшчыкаў, калі нам скамандуюць па іх страляць? Газарылі, што ўчора было выдана распараджэньне аб спыненьні забастоўкі", думаў ён далей сабе. Цікава ці і наш бацька таксама бастуе з усімі кулі?.. Як мяне забралі ў салдаты, ён працаваў у тым доку, дзе перш-найперш пачалася забастоўка".

А тым-часам жывая калёна выразна скіравалася да Вампы і докаў. Цяпер ужо ня было ніякага сумліву, куды і з якой мэтай вядуць іх сюды. Яшчэ мамэнт і падуўшы з рэкі вецер прынес да вушэй салдат моцныя, сьмелыя гукі песьні працы й змаганьня.

— „Прыбавіць шагу!" — скамандаваў афіцэр.

Калёна цяпер ўжо чуць ня бегла, а афіцэру здавалася, відаць, што яна ідзе надта памалу. Ен нецярпліва аглядаўся на салдат, з недаверрам аглядаў з ног да галавы спатыканых па дарозе людзей і штосьці мармытаў сабе пад нос.

З кожным шагам уперад салдаты бачылі ўсё большую і большую сумаціцу.

Кучкі людзей, якія пападаліся па дарозе, злосна паглядалі на іх і беглі пасьпешна кудысьці ўперад. Работніцкая песьня тымчасам чулася ўсё бліжэй і бліжэй. Мінуўшы яшчэ з дзьве крывыя брудныя вуліцы, салдаты ўбачылі перад сабою вялікае мора людзкіх галоў, чырвоных сьцягаў і трафарэт з рознымі надпісамі:

— „Рыжу"!

— „Працы"!

— „Прэч з барадатымі белымі кравапіўцамі"!

Пачуўшы такія крыкі, салдаты ўздрыгнулі і яшчэ болей насупіліся і пахмурнелі. Адным з іх ўспомнілася свае яшчэ нядаўняе галоднае бадзяньне па доках, фабрыках і складах багатых эўрапэйцаў, успомніліся шыкарныя аўты і дамы гэтых крывапіўцаў і брудныя халупы, у якіх жылі яны самі. Іншым узноў успомнілася ліпкая лёсавая глеба рыжавых плантацый, цяжкая праца на іх пад прасмамі гарачага сонца, галоднае жыцьцё ў роднай зямліцы, бо — большасьць сабранага рыжу трэба было аддаць на падаткі.

„Рыжу!.. Працы!.. „Прэч з барадатымі белымі крывапіўцамі і наймітамі!" — крычаў натоўп і сунуўся ўперад, што раз то ўсё болей і болей зьбліжаючыся да салдат; паходка дэманстрантаў была сьмелая, цьвёрдая; бадзёра йшлі яны ўперад, нашэршчаныя штыкі салдат іх, відаць, ня пужалі, яны былі, відаць, пэўныя сваей перамогі.

— „Стой!"—скамандаваў афіцэр „Набіць стрэльбы"!

Па прывычцы машынальна споўнілі салдаты загад афіцэра — стрэльбы былі набіты.

Здаволены з паслушнасьці і стройнасьці сваіх салдат афіцэр лоўка павярнуўся на кані і, высунуўшыся на некалькі мэтраў уперад, скамандаваў маніфэстантам разыйсьціся.

— „Есьці!... Мы хочам ёсьці!.. Мы гінем ад цяжкай працы і голаду"!.. — пачуўся з натоўпу адказ на гэты пракляты загад.

— „Разыйдзецеся!.. Інача будзем страляць!.. Перастраляем вас усіх"!..

— „Браты!.. — вы ня можаце быць наймітамі подлых барадатых людзей! Няўжо вы стрэліце ў нас за тое, што мы боронімся ад галоднай сьмерці і паняверкі"?! крыкнуў, як мага мацней, йшоўшы ўперадзе натоўпу Хоўэнь-Яо салдатам.

Словы Хоўэнь-Яо, як рэха па лесе, пракаціліся па пярэдніх радох ваякаў і замерлі, не дакаціўшыся да канца іх. Але іхні сэнс, боль, з якім былі яны сказаны, як электрычная іскра пракаціліся па радох гэтых узброеных людзей, заварушылі і пад салдацкай адзёжай людзкое сэрца, прыпомнілі ім іх галодныя дзяцінныя гады, не адзін штурхач ад купца-эўрапэйца і стрэльбы ў іх руках задрыжэлі.

— „Расхадзецеся!... будзем страляць'

— „Рыжу!... Працы"!... загрымеў у адказ натаўп ужо пад самым носам афіцэрскага каня.

Афіцэр паблядней ад злосьці і скочыў на фланг свайго атраду.

— „Цэлься!... Плі!... скамандаваў ён салдатам.

Салдаты задрыжэлі. Некатарыя з іх машынальна паднялі стрэльбы да пляча і выстралілі, але большасьць асталася нярухомая, быццам яны раптам скамянелі. Да гэтых скамянелых фігураў належаў чуць ня ўвесь першы рад; паміж імі быў і Кай Ю Сянг.

Грозны афіцэр пажаўцеў ад злосьці і спачатку, відаць, сам ня ведаў, што рабіць з такім раптоўным непаслухамянствам салдат. Клясавая розьніца скора, аднак, узяла ў ім перавагу над усім іншым. Выхапіўшы з кабуры рэвольвар, закруціўся ён перад салдатамі.

— „Хто ня будзе спаўняць загаду, улажу тут на месцы"!... крычаў ён, грозна махаючы рэвольварам.

Кай Ю-Сяг аднак ня бачыў афіцэрскага рэвольвара, ня чуў і яго грозьбаў. Расшыранымі вачыма глядзеў ён на жудасны абраз, які зьявіўся перад ім пасьля навет тых малых лікам стрэлаў, што былі пушчаны з салдацкіх радоў. Некалькі чалавек у сьмяротных муках пакацілася на зямлю, з іншых цякла кроў. Маніфэстанты захваляваліся — часьць з іх папяцілася назад, менш адважныя кінуліся навет убакі, падняўшы праразьлівы крык і енк.

Мамэнт рашучы — яшчэ адзін залп, яшчэ троху сумаціцы ў пярэдніх радох і ўсё гэта мора галодных людзей можа рынуцца на зламаньне карку ўцякаючы і разьбягацца.

— „Таварышы да нас!... не страляйце! каго вы маеце бараніць"?! крычалі з натаўпу, акрываўленыя фігуры.

— „Таварышы, мы ня стрэлім у нашых галодных братоў"!... крыкнуў, быццам абудзіўшыся са сну, Кай-Ю-Сянг, кідаючы на зямлю сваю стрэльбу.

— „Сабака"! скрыгнаў праз зубы афіцэр і падняў рэвольвар.

Дарэмна аднак было стараньне англійскага служкі — куля праляцела міма і нікога з салдат не зачапіла. Другі раз яму страляць ня прышлося — натаўп ужо цягнуў яго з каня, а салдаты бараніць яго ня зьбіраліся. З песьняй змаганьня на вуснах зьліваліся яны з галодным натаўпам, з тым натаўпам, з радоў якога яны ўсяго некалькі месяцаў таму назад былі выбраны, каб пасьля вярнуць іх у гэты натаўп назад хворымі, а можа і пакалечанымі.

Паражэньне сацыял-дэмакратаў у Аўстрыі.

Сацыял-дэмакраты, якія йгралі ў часе венскіх падзеяў найбольш сьмешную ролю, аднолькава выклікалі проці сябе пагарду — як з боку радыкальных работніцкіх масаў, таксама і з боку буржуазных урадавых групаў. Бо ж сьпярша яны-ж, сацыялісты, за апраўданьне забойцаў сваіх таварышоў судом—паднялі гнеў работнікаў, пасьля, калі гэты гнеў разгарэўся ў магутны народны рух, які знайшоў сабе больш радыкальных павадыроў, яны, сацыял-дэмакраты, зараз-жа перакінуліся на бок пануючай буржуазіі, з якой разам пачалі ўсімі сіламі ламаць паўстаньне работнікаў, каб — за ўсялякую цану ня даць яму разьвярнуцца ў сацыяльную рэвалюцыю...

Дык у часе разрухаў сацыялісты яшчэ маглі весьці перагаворы з урадам, дыктаваць яму свае варункі,—бо тады іх павадыры былі патрэбны ўраду для здушэньня работніцкага бунту. А калі ўрад—з дапамогай „павадыроў пралетарыяту“ — задушыў бунт, тады...—тады, паны сацыялісты сталі—зусім непатрэбнымі пануючай буржуазіі, дык прэм'ер Зэйпэль напросту перастаў навет гутарыць з іх павадырамі дый—лічыцца з „трэбаваньнямі ды варункамі“... Вышла ўсё вельмі падобна да таго, як у нас—з панамі пэпээсамі...

Тады, як і нашы пэпээсы, венскія сацыялісты ўдарыліся ў „вострую апазіцыю“... у прэсе. „Тон сацыял дэмакратычнай прэсы, піша з Вены карэсп. „Кур. Варш.“,—вельмі зачэпны“. Сацыялісты страшэнна лаюць прэм. Зэйпэля за тое, што той з пагардай адмовіўся ад усялякіх кампрамісаў з імі. Сацыялісты страшаць урад—новым выбухам работніцкага гневу... Але цяпер ужо буржуазная прэса ня толькі не баіцца гэтых пагрозаў, але піша, каб гэтыя паны сядзелі сабе ціха, бо інакш — буржуазная большасьць паслоў пастановіць—распусьціць Сойм (дзеля гэтага патрэбна ў Аўстрыі звычайная большасьць галасоў, якую маюць буржуазныя групы Сойму...) ды зрабіць новыя выбары... А гэтага цяпер сацыялісты баяцца больш усяго: новыя выбары далі-б цяпер поўны правал сацыял дэмакратыі, якую—як справа так і зьлева, аднолькава ненавідзяць —адны за „выкліканьне“ крывавых падзеяў, другія—за здраду работніцкага руху.

Паразуменьне між Англіяй і Японіяй на канфэрэнцыі ў справе разбаеньня на моры

Англійскія і японскія дэлегацыі паразумеліся між сабой па ўсіх пунктах у справе абмяжаваньня збраеньняў на моры.

Англійскія дэлегаты экстрэнна выехалі ў Лёндан, каб урад зацьвердзіў іх становішча. Жэнэўскія газэты пішуць, што паразуменьне між Англіяй і Японіяй было найцяжэйшым пунктам канфэрэнцыі. Паразуменьне з Амэрыкай быццам будзе ўжо значна лягчэй (?) Гэта паразуменьне ў справе збраеньняў на моры аддасьць усю сусьветную ўладу фактычна ў рукі гэтых трох дзяржаваў, якія дагаварыўшыся між сабой, будуць дыктаваць сваю волю ўсім іншым... пакуль не пасварацца між сабой.

Вельмі характэрна, што Англія сьпярша паразумелася з Японіяй, каб разам з ёй націскаць на Амэрыку. А ведама, што на Вашынгтонскай канфэрэнцыі, на якой былі апрацаваны падставы паразуменьня між гэтымі 3 дзяржавамі ў справе разбраеньня на моры, Англія пайшла з Амэрыкай проці Японіі, змусіўшы апошнюю падпарадкавацца рашэньню дзьвюх першых, дый парваўшы тады навет саюз з Японіяй. Цяпер яена-ж—супольныя інтарэсы ў Кітаі зрабілі рашучы паварот у англійскай палітыцы—у бок Японіі.

Паны Чэмбэрлены працуюць.

Польскія газэты пішуць, быццам нямецкі Дзяржаўны Банк—пад націскам амэрыканскага і англійскага банкаў — абавязаўся адмовіцца надалей ад прыняцьця ды ўчоту радавых вэксалеў. Адначасна дырэктару нямецкага банку дана зразумець, што далейшыя крэдытовыя палёгкі, якія ён робіць Радам, могуць выклікаць розныя труднасьці для нямецкіх апэрацыяў на амэрыканскім і англійскім грашовым рынку.

Як ведама, уся нямецкая прамысловасьць працуе будучы фінансавана амэрыканскім капіталам, дык, калі праўда, што пішуць газэты, нямецкай вернасьці саюзу з Радамі прадбачыцца цяжкая спроба.

Чэмбэрлен хоча прыехаць у Бэрлін ды запрасіць Гіндэнбурга ў Лёндан...

Чэмбэрлен хоча за ўсялякую цану здабыць сабе прыязьнь Нямеччыны — пэўна ж усё—з мэтай уканцы прыцягнуць яе да супольнага фронту проці СССР... Англійскія газэты пусьцілі вестку, што Чэмбэрлен мае паехаць увосені ў Бэрлін, каб асабіста пагутарыць аб бягучых справах з Штрэзэманам. А нямецкія газэты дадалі, што Чэмбэрлен, прыехаўшы ў Бэрлін, мае яшчэ і асабіста запрасіць прэзыдэнта Гіндэнбурга—на візыту ў Лёндан. Уся прэса слушна бачыць у гэтых намерах Чэмбэрлена імкненьне да асаблівага зближэньня Англіі з Нямеччынай. Справа ў тым, што ў пачатку верасьня адбудзецца Агульная зборка Лігі Народаў, на якой маюць вырашацца розныя важныя справы, на якім паміж іншым Нямеччына мае рашуча паставіць дамаганьне — калі не скасаваньня, дык значнага зьменшаньня акупацыі. Адначасна англійская прэса энэргічна дае да зразуменьня Францыі, што Нямеччына, споўніўшы ўсе абавязкі разбраеньня, мае ўсе правы на рашучае зьменшаньне акупацыйных войскаў. Англійская прэса заклікае ўрад, каб той узяў на сябе пачын гэтага зьменшаньня, каб гэтым цясьней завязаць прыязныя адносіны з Нямеччынай...

Камуністычны працэс у Парыжы.

У Парыжы адбыўся працэс камуністаў, абвінавачаных у шпіёнажы на карысьць СССР. Як і трэба было спадзявацца, працэс гэны скончыўся кампрамітацыяй францускай ахранкі, якая сфабрыкавала яго, каб зайграць на нацыянальных пачуцьцях несьвядомых і маласьвядомых работніцкіх мас і пасадзіць у турму відных прадстаўнікоў К. П. На супроць зьвягі буржуазнай прэсы—сьведкі на судзе даказалі, што дакуманты, знойдзеныя ў камуністаў, ня былі тайнымі, а ляжалі ў адчыненых кожнаму даступных шафах. Што да абвінавачаньня, што яны выдалі канструкцыю процігазавых масак, дык аказалася, што іх фатаграфіі і падробнае апісаньне былі зьмешчаны ў францускіх часопісях. Камуністы Кошэлэн і Сінгр аказаліся правакатарамі. Апошні з іх прызнаўся, што пераданыя таварышам дакумэнты атрымаў з рук паліцыі з мэтай правакацыі сваіх таварышоў. Вось-жа ўвесь працэс скончыцца прысудам за кражу (!?) урадовых дакумэнтаў. Разам з тым гэты працэс зьявіцца поўнай кампрамітацыяй францускай паліцыі і канфузам усей буржуазнай прэсы.

Бунт у Тулонскай марской турме.

У Тулонскай турме выбухнуў бунт, які з вялікім трудом удалося пагасіць. Матросы, якія былі пакараны за пяяньне Інтэрнацыяналу, братаньне з паўстанцамі ў Марокко і непаслухмянасьць начальству ў часе вайны, чакалі на дзень 14 ліпня амнысты. Калі-ж іх спадзяваньні не апраўдаліся, яны пачалі бунтавацца: зьвязалі старажоў, выламалі браму і выйшлі на волю. Між прыбыўшай у гэты мамэнт паліцыяй і вязьнямі, якія вырваліся з турмы, пачалася бойка, у выніку якой вязьняў зноў увагналі ў турму. Гэтак пісана ў урадовай газэце, ведама каб ня ўзбурыць работніцкую грамадзкую апінію ў-ва Францыі. „Юманітэ“ кажа аб непакоях, якія трывалі ў працягу 2 дзён і якія былі стлумлены дзьвюма брыгадамі жандармэрыі пры дапамозе аружжа; яшчэ на чацьверты дзень бунт у турме трываў. Чутно было пяяньне Інтэрнацыяналу і крыкі вязьняў. Кардон паліцыі акружаў турму.

Фабрыка фальшаваньня савецкіх дакумэнтаў.

„Лёвр“ і „Юманітэ“ прыносяць новыя інфармацыі аб фабрыцы фальшых дакумэнтаў, выкрытай савецкім пасольствам у Парыжы. Парыжская арганізацыя стаяла пад кіраўніцтвам генэрала Кутёпава разам з 2 дырэктарамі белагвардзейскімі агэнтамі Різяновым і Матінянам. Парыжскае бюро арганізацыі мела сваім заданьнем выставіць савецкае пасольства, як цэнтр бальшавіцкай прапаганды. Розным пасольствам у Парыжы прапанаваліся (ведама, за грошы) дакумэнты, якія рабілі ўражаньне запраўдных. У гэтых паперах былі інструкцыі адносна паўстаньняў і пакушэньняў на вызначныя асобы. Гэткія дакумэнты прапанаваліся прадстаўнікам Англіі, Італіі, Югаславіі, Румыніі, Галяндыі, Кубы, Чылі, Аргэнтыны, Мэксікі, Парагвая і інш. За дакуманты даставалі ад 8 да 16 тысяч франкаў. Найбольш заплаціла за гэткую інфармацыю Гішпанія, бо аж 18 тысяч, каб мець магчымасьць адкрыць няістнуючы загавор анархістаў. Фатаграфія аднаго гэткага дакумэнту зьмешчана ў „Юманітэ“ з усімі адзнакамі тайнага дыпляматычнага дакуманту. Гэтая кумпанія была раскрыта ўласьнікам друкарні, у якой друкуюцца дзяржаўныя паперы савецкага пасольства. Да яго зьвярнуліся быццам ад імя савецкага пасольства з заказам папер Выканаўчага Камітэту Камінтэрну. Аб гэтым падазронным заказе гаспадар друкарні паведаміў пасольства. Пасьля доўгага сачэньня ўдалося арыштаваць двох сяброў гэтай банды Соловского і Дівілковскаго, а таксама іх памоцніка. Рэшта ўцякла. Судовы працэс у гэтай справе адбудзецца ў найбліжэйшым часе.

„Жалоба“ румынскай валюты...

Што ў Румыніі зусім ня зусім так добра і спакойна, як расьпісваюць урадавыя камунікаты, аб гэтым сьведчыць найляпей раптоўнае падзеньне курсу румынскай валюты—навет на „прыязнай“ парыжскай біржы.

Арышты сярод ваенных у Грэцыі.

У зьвязку з пабегам з вастрогу ген. Пангалёса арыштавана рад афіцэраў арміі і флёту. Раскрыты быццам падрыхтаваны сярод ваенных загавор (змова), меўшая зрабіць дзяржаўны пераварот — на карысьць былога дыктатара Пангалёса.

Каталіцкія біскупы ня спыняюць паўстаньня проці ўраду ў Мэксыцы.

Часткова зьліквідаванае паўстаньне каталіцкіх біскупаў у Мэксыцы ізноў загарэлася з новай сілай. Паўстанцы маюць армію— у 3.000 жаўнераў, з якімі ўрадавыя войскі дагэтуль ня могуць яшчэ справіцца. — Запраўды-ж, добра, відаць, падзеяла тое „багаслаўленьне“, якое толькі-што паслаў Рымскі Папа паўстанцам проці законнага, але... залішне радыкальнага—бо забіраючага ад царкоўных абшарнікаў зямлі для працоўнага хлебароба—ураду...

Няўдачнае паўстаньне на высьпе Яве.

На высьпе Яве, якая належыць да Галяндыі, паліцыяй раскрыта змова камуністаў, якія мелі падняць паўстаньне ў гэтай калёніі. Прыняты рашучыя меры, войска, флёт, паліцыя зараз-жа змабілізаваны. На ўсей высьпе абвешчана ваеннае палажэньне.

У Рэспубліцы Балівіі паліцыя адкрыла аж 3 камуністычныя змовы. Камуністы быццам мелі забіць прэзыдэнта, захапіць уладу ды стварыць тут радавую ўладу. Павадыр камуністаў, Наварра, з 10 бліжэйшымі супрацоўнікамі арыштаваны. Быццам знойдзены ў іх значныя сумы грошаў...

Трэба тутака напомніць,—аб тых рэвэляцыях, якія ў свой час зрабіў знаменіты галяндзкі пісьменьнік Дэкер,—тых гвалтах якія практыкуюць мясцовыя галяндзкія ўлады адносна каляровага насяленьня калёніяў. Дык тады, можа, лягчэй будзе зразумець, чаму гэта і тутака так сільна дзее „камуністычная агітацыя“, дый так страшэнна ненавідзіць улада гэтых „агітатараў“, бязупынна творачы сама для іх—аж па 3 „камуністычныя змовы“ зараз, каб толькі— за ўсялякую цану—вылавіць усіх павадыроў і арганізатараў народнага пратэсту проці нялюдзкіх парадкаў, пануючых у краі...

Дынастычныя клапоты Румыніі.

Ведама кожнаму, колькі клапотаў можа даставіць краю, дзе істнуе яшчэ манархічны лад,—царская ці каралеўская сям'я, у якой пануе нялад, сваркі, блутаніна. Дык вось, у такім палажэньні апынулася цяпер Румынія. Памёр яе кароль Фэрдынанд. Першы наступнік трону прынц Кароль пазбаўлены бацькам правоў на пасад; дык цяпер наступнікам трону зьяўляецца сын гэтага прынца Кароля, унук караля Фэрдынанда—Міхал. Гэтаму Міхалу толькі 6 гадоў, але ён толькі-што 20 ліпня абвешчаны каралём—на ўрачастым Нацыянальным Зборы (супольным паседжаньні абедзьвюх палатаў Парляманту) — ў прысутнасьці габінэту, найвышэйшых саноўнікаў і дыплёматычнага корпусу. Але-ж, ведама, 6-летні хлапчук ня можа фактычна быць каралем, дык заўчасу была зложана так званая „рэгэнцыйная рада“, якая мае правіць дзяржавай замест гэтага 6-летняга караля. Урад зложаны з 3 асобаў: другога сына памёршага караля, прынца Мікалая, патрыярха Румынскай Царквы і 1 старшыні найвышэйшага Суду. Гэтая рада мае ўпраўляць дзяржавай аж 15 гадоў, пакуль не дасягне паўналецьця кароль Міхал.

Пакуль што ўсё ідзе неяк гладка.—Новаму каралю прысягнула перадусім гэтая Рада, прысягнуў Парлямант, войска.

Але кожнаму ясна, які нясталы ды нятрывалы лад зроблены гэткім парадкам. Перадусім, першы сын караля Кароль, хаця адмовіўся і сам ад пасаду, аднак-жа зусім ня выракся думкі панаваць у Румыніі, — „калі яго пакліча народ“... І ўзапраўднасьці, у краі ёсьць шмат прыхільнікаў прынца Кароля. Дык гэты Кароль, які жыве ў Парыжу, пачуўшы аб сьмерці старога караля, зараз-жа захацеў ехаць,—каб, як добры сын, быць на хаўтурох свайго бацькі. Але на сваю тэлеграму аб дазволе яму прыехаць (бо-ж пазбаўленьне правоў на пасад злучана з забаронай павароту да краю) ён дастаў ад прэм'ера Братыяну, які цяпер зьяўляецца фактычным дыктатарам Румыніі,—рашучую адмову. Пазываючыся на нейкі прадсьмертны ліст караля, Братыяну забараніў каралеўскаму сыну прыехаць навет на хаўтуры яго бацькі. Ясна, наскольні румынскія ўлады баяцца прынца Кароля... Кароль быццам падпарадкаваўся забароне, але вось з Парыжу даносяць, што ён раптам выехаў у няведамым кірунку на аўтамабілі... А з румынскае сталіцы ідуць весткі аб тым, што прыхільнікі Кароля пачалі кратацца вельмі энэргічна. Навет сам міністар заграніčных спраў ураду Братыяну трэбуе, каб Кароля ўпусьцілі ў Румынію. Вядуць нарады абедзьве апазыцыйныя партыі—сялянская і кансэрватыўная, сярод якіх—шмат гарачых прыхільнікаў „адстаўнога прынца“, хаця ёсьць вестка, што павадыры сялянскай партыі ўжо прызналі каралём Міхала. Баючыся разрухаў, Братыяну прыняў надзвычайныя меры для захаваньня парадку; у краі пануе такі паліцэйскі тэрор, якога ня было навет у часе апошніх выбараў. Навет усе тэлефонавыя гутаркі праходзяць праз вуха шпікоў, якія ловяць перадусім імя Карола.., а тады хапаюць людзей ды садзяць у вастрог.

Дык трэба думаць, што цяпер Кароль і яго прыхільнікі ніякіх выступленьняў рашучых рабіць ня будуць, але—начакаюць больш суадказнага часу, калі „бачнасьць“ румынскай паліцыі крыху ўляжацца... Але—што ў Румыніі ня сёньня-заўтра пачнецца дынастычная блутаніна ды калатня, у гэтым ня можа быць сумліву. Дык, як пішуць газэты, — удоўж румынскай граніцы сабраны значныя войскі СССР, асабліва на граніцы Бэсарабіі. — Так сабе,—на ўсялякі выпадак...

ХРОНІКА.

Ну і зьезд! Як падаюць газэты, на адбытым у мінулую нядзелю „зьезьдзе“ Ярэмічаўскай часткі сельсаюзу было прысутных (з усяе Заходняе Беларусі!) аж... 8 (выразна—восем) дэлегатаў з правінцыі і... 11 (адзінаццаць) з Вільні... Як відно — генэралаў куды больш, як войска. Як чулі сябе „лідэры“ — ведаць ім, але прамовы гаварыліся ўсё роўна, як і прад тысячнай публікай (пэўна ж паслы Ярэміч і Рагуля маюць добрыя лёгкія!).

У выніку аказаўся „выбраны“ аж цэнтральны камітэт, куды ўвайшлі п. п. Ярэміч, Рагуля, Більдзюкевіч. Юхневіч, Куніцкі, Сьвістун і Туронак. Чуць ня больш, як было прысутных на зьезьдзе. Але ж!... Самі сябе і выбралі.

Усё тые-ж і Пятрэнка. А гэты Пятрэнка—п. Туронак, які, як здаецца, належыць і да складу такога-ж „цэнтральнага камітэту“ хадэцыі, ды прынамся лічыцца ў ліку „цэнтральных“ фігураў апошняе.

Ліпнёвай раніцай.

Ліпнёвай раніцай ўздыхала неба,
У паветры пахнула расою. Цішыня...
Туманам грудзь акутала зямля,
Зялёным пырнікам асыпалася глеба.
Прастору глыб, блакітная дуга
На кругазоры лесу апусьцілась.
Пад грудзі з болю сэрца закацілась,
Гняздо зьвіла ў грудзёх маіх туга.
У вастрозе раніца кадзіла дым вясны
Пад ціўканьне на даху вераб'ёў.
Клубок дзяцінай радасьці і днёў
Разьвіўся. Супакой укралі сны.
Бялеў туман ў паветры малаком,
І малака прыемны пах карозы
Заказытаў мне нос. Курыўся дым вясновы.
Вастрог душыўся кратаў талакном,
Здалі даносіцца мне трахтаньне дарогі...
Аб сьветлай раніцы задумалася даль...
У хмаркі бела-сіні шаль
Сягнулі месяца бялеючыя рогі.
У вастрозе раніца кадзіла дым вясны.
Кра-кра!—на даху чорная варона—
І гэты крык, падобны сьмерці стона
Трывожыў мой спакой, каханьня сны.
Агністы пук, куль сонечнай саломы,
Праз краты пырснуў, дрыгнуў на пасьцель, —
І туману расплыўчаты кісель
Прапаў і зьнік, як гукі звону.
Агністы пук лізаў цамэнту ногі,
На даху вераб'і спраўлялі гучны хор,
Сьмяялась даль, сьмяяўся кругазор.
Здалёк няслося трахканьне дарогі.
Тррр... Сьвісток. Вастрожнікі усталі,
Сьмяюцца з лёх і кашляюць з вакон
І фабрыкаў працяжны востры стон
Хавае раніцы ліпнёвай чары.
Ліпнёвы дні, як вечнасьці кудзелю,
Прадзе майго жыцьця верацяно.
Як гаспадар бязбожны у нядзелю
Перасыпаю дні, як на таку зярнё.
Душою, сэрцам я—і моцны і цьвярозы,
Мне аднастайнасьцяў ня страх жыцьця:
Я—пралетар, я новых дзён дзіця,
Ня страшны мне дні буднічнае прозы!
У грудзёх маіх поэзія бурліць, —
Я—валадар над уласнаю красою,
Я песьні барацьбы нясу з сабой,
Я жыць хачу, цярпець, кахаць, тварыць!

Лукішкі 25.VI—27. **Ал. Салагуб.**

Вось як „паважна“ выглядае „сялянскі“ саюз п. п. Ярэміча і Рагулі...

Да выбараў у Мястовую Раду м. Вільні. У дадатак да паведамленьня аб выбарах у Мястовую Раду м. Вільні ў мінулым нумары падаюцца рэзультаты галасаваньняў, што да паасобных кандыдатаў.

Перш было прадстаўлена аж 6 кандыдатаў, з якіх атрымалі галасоў: Плаўскі (ППС) —9, Ян Пілсудскі—6, інж. Крэмэр—3, Банькоўскі (б. прэзыдэнт Рады, эндэк)—2, Абрамовіч—2. Беларускі кандыдат К. Крук атрымаў—5 галасоў. Кандыдатура Абрамовіча была высунена і паддзержана толькі расейцам (Багдановічам) і літвіном.

На другое галасаваньне былі пастаўлены 4 кандыдатуры. Галасы ўпалі—п. Фаліеўскі (цяперашні Камісар Ураду м. Вільні)—17 галасоў, Банькоўскі — 15, Плаўскі — 12 і Крук—4.

З двох кандыдатаў, даставшых найбольш галасоў пры трэцім галасаваньні пан Фаліеўскі дастаў 26 галасоў і Банькоўскі — 15 гал. Работніцкія кандыдаты падалі белыя карткі.

Выбраны прэзыдэнтам п. Фаліеўскі, па чутках пакідае сваю пасаду Камісара Ураду на м. Вільню.

Кампанія „Słowa“ на карысьць Кавэрды. Абшарніцка-манархічнае „Słowo“ распачало станоўчую кампанію для асвабаджэньня засуджанага бандыты — Кавэрды. Газэта і стаячыя пры ёй колы абшарнікаў зьвярнуліся да п. Прэзыдэнта з просьбай аб памілаваньні, матывуючы просьбу (навет у плаксівых выразах!) тым, што маладому хлапцу... вельмі-ж цяжка сядзець у мурох.

Як вядома, просьбу аб памілаваньні паслаў да п. Прэзыдэнта і сам суд, які судзіў Кавэрду.

Па апошніх вестках п. Прэзыдэнт адкінуў гэтыя просьбы.

Новыя культурныя сілы. Апроч асобаў, паданых у мінулым нумары, у гэтым годзе скончыў Віленскі Унівэрсытэт па мастацкаму аддзелу наш вядомы мастак **Сяргіевіч.**

Галоўная Управа Т-ва Белар. Школы падала просьбу ў куратарыум аб дапушчэньні з восені гэтага году абітурыентаў беларускіх гімназіяў (скончыўшых 8-ю клясу), да экзаменаў на матуру па ўсіх прадметах, апрача полёністыкі, у беларускай мове і каб экзамінацыйная камісія была зложана пры Віленскай Беларускай Гімназіі для матурыстаў усіх беларускіх гімназіяў.

Беларускае Выдавецкае Т-ва распачало працу па выданьню календароў на 1928 год (адрыўнога і кніжкі). Хто хацеў-бы даць свае ўвагі, што да зьместу календароў, Т-ва просіць прыслаць да 10 жніўня на імя сэкрэтара Т-ва гр. І. Дварчаніна па адрасу — Вільня, Віленская, 12—6.

Афіцыяльны курс грошы на 26 ліпня Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

26./VII. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе развіцьцю роднай беларускай прэсі.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выплачвайце свой доўг.

З жыцьця Горадні.

× Пратакол паседжаньня сяброў Горадзенскай Акружной Управы і Наглядная Рады, які адбыўся ў м. Горадні дня 24./VII. 1927 г. Прысутны прадстаўнік Галоўнай Управы І. Дварчанін. З правам дарадчага голасу прысутныя таксама сябры прэзыдыюму Горадзенскага Гуртка.

Паседжаньне адчыняецца прывітальным словам ад імя Галоўнай Управы грам. Дварчаніна, што з падзякай і задаваленьнем прымаецца.

По дакладзе старшыні Управы грам. Сяўрука аб працы Акружное Управы і аб пляне далейшай працы, вынесена пасьля дыскусіі наступная рэзалюцыя:

Прыймаючы пад увагу ненармальнасьць абставінаў, у якіх працякала дасюлешняя праца Акружное Управы,—Акружная Управа разам з Наглядная Радай і ў прысутнасьці прадстаўніка Галоўнай Управы грам. Дварчаніна прызнала неабходным вызначыць асобнага інструктара для сувязі з паветам, які павінен у найбліжэйшым часе сабраць усе весткі аб працы на мясцох і аб гатоўцы усіх актыўных сілаў, каб потым распачаць больш актыўную і сыстэматычную працу. Інструктарам запрашаецца грам. Язэп Баліцкі, які павінен быць адказным перад Акружной Управай. У інтарэсах прадуктыўнасьці працы вынесена пажаданьне, каб былі часьцей робены паседжаньні Акружное Управы разам з Наглядная Радай.

Вынесена падзяка Галоўнай Управе за прысланага прадстаўніка ў асобе грам. Дварчаніна, які дапамог вырашыць найважнейшыя пытаньні, і пажаданьне, каб Галоўная Управа прысылала часьцей свайго прадстаўніка.

У бягучых справах прызнана неабходным адчыненьне ў бліжэйшы час у Горадні кнігарні, а таксама вынесена пажаданьне, каб у Горадні была ў гэтым годзе адчынена Гімназія. Апроч таго, прызнана проста неабходным зьмяніць памяшканьне Управы на больш суадказнае.

× **Хадэцкі дэбюты.** У нядзелю 17-га ліпня ў залі былога кіна „Сатурн", у сувязі з выбарамі, якія адбываюцца ў павеце, адбыўся мітынг, ладжаны польскай хрысьціянскай дэмакратыяй. На гэтым мітынгу адзін з прамоўцаў з партыі чорна сутанікіх хрысьціянскіх дэмакратаў Ястжэмбскі перад 300-галовым натоўпам заявіў, што „Białorusini jest zakięte wrogi naszej najukochańszej Polski", пры тым падкрэсьліў... трэба на іх узірацца і адносіцца да іх, як да ворагаў, бо кожны беларус „to jest komunista". Вось, браточкі, як правакуюць нас гэтыя нібы-та хрыстовыя пасьледавальнікі, сваімі прамовамі падымаючы дух і азвярочваючы дафэнзыву да новых рэпрэсіяў і гвалтаў над намі. Што-ж мы на гэта адкажам „яснавяльможным" пану праваўцу? Ну, што-ж утапаючы за саломку хапаецца, кажа прыказка, так і вы, бачучы паўнейшы банкрот свае палітыкі, хапаецеся за апошні засоб барацьбы ілжывымі доносамі, думаючы гэтым паправіць свае шансы. Але вельмі мыліцеся, бо наш беларускі народ, сьвядомы свае магутнае сілы і заданьняў не павядзе ўжо ані „сваім", ані чужым нацыянальным і палітычным авантурнікам, а тым болей вам, хадэкам, служкам чорнае рэакцыі, тарганаць налева і направа сваёй скурай.

× **Архірэй у ролі бульварнай газэтні.** Прыкра стала нашаму айцу духоўнаму Аляксею і надакучыла сядзець у сваей рэзыдэнцыі над Гарадніччанкай. Дай, кажа, пацешу народ праваслаўны. Ну, і пацешыў. Было гэта ў адзін з сонечных дзён, 17-га ліпня с. г. Зьвярнуўшыся да свайго хурмана (а наш прэвялебны айцец архірэй ніякім чынам ня ходзіць) дый кажа: „вязі мяне на Калюжу да старое царквы; трэба памаліцца дый казаньне кое-якое сказаць аб сучаснай палітычнай сітуацыі (ведаеце, яны ў нас, апроч сваіх беспасярэдных абавязкаў, любяць трохі папалітыкаваць). Ну і зачаў з гэтакім слоў „праваслаўныя хрысьціяне, якія жывеце пад уладай Польшчы!— ня пішэце лістоў да родных і знаёмых у СССР, бо паштовая канвэнцыя з ёю зарвана, а хто будзе пісаць, той будзе строга пакараны і перасьледаваны уладай і г. д. Пачуўшы гэта, хацелася запытаць, скуль ён мае такія весткі, бо такой хлусьні ніводная навет горадзенская брукоўка і дэфэнзыўная газэтка ня пісала, а на што яны любяць з мухі рабіць слана і раздуваць сэнсацыю! Трэба было-б адносным уладам зьвярнуць належную ўвагу на гэтую хадзячую газэціну, сейбіта розных ілжывых вестак, каб ён ня выходзіў з рамак сваіх папоўскіх заданьняў. **Молат.**

Агулам пачалася сьветлая картка нашага жыцьця і калі кольвек на ей і зьяўляецца пляма ў пастаці пьянага, дык ён божыцца і прысягае, што бабы на радзінах напаілі. Але калі папрацуем далей, то мінецца і гэта.

Гэтае новае жыцьцё пачалося з мамэнту з'арганізаваньня гуртка Таварыства Беларускае Школы, які адразу пільна ўзяўся за працу. Пры гуртку істнуе тэатральная сэкцыя, якая ў кароткі праця́г, паставіла два спэктаклі. Першы раз 22 траўня ігралі п'есу Ф. Аляхновіча „Шчасьлівы Муж". Другі раз 3 ліпня—п'есу „Чорт і баба". Спэктаклі сашлі досыць добра і пакінулі па сабе прыемнае ўражаньне, асабліва другі спэктакль, на які за гадзіну да пачатку былі прададзены ўсе білеты. Увесь даход ад спэктакляў пайшоў на карысьць кніжніцы пры гуртку.

Чэсьць і хвала вам маладым сейбітам нашае роднае культуры. **Сябра.**

Гмінны дармаед.

(Ярэміцкая гм., Стаўпецкага пав.).

Амаль-што ня кожны дзень здараецца мне праходзіць каля будынку нашае гміны. Кожны раз я бачу, як гмінны сэкрэтар пан Славамір-Зарэмба ў часе службовых гадзінаў возіцца на дварэ з сваімі дзяцьмі, або корміць гусі ды куры.

Аднаго разу патрэбавалася мне пайсьці ў гміну. Узыйшоўшы на гмінны ганак, пачуў з кухні сэкрэтара нейкую лаянку: мужчына лаяў кабеціну. Я ўвайшоў у канцэлярыю. Растлумачыў першаму-лепшаму пісарчуку, чаго прыйшоў. Пісарчук адказаў, што маю справу ўладзіць сэкрэтар. Застаўся я чакаць. Тым-часам лаянка з кухні цераз тонкую перагародку даносілася і ў канцылярыю. Прысеў я на лаўцы, ды воляй-няволяй прышлося слухаць, як людзі сварацца. Даведаўся я, што гэта сэкрэтар сварыцца са служанкаю ды крычыць на яе за тое, што курыца згубіла яйцо. Бедная служанка толькі і тлумачылася тым, што гэта не яе інтэрас, бо пан сэкрэтар сам куры шчупае.

Пасьля паўгадзіннае сваркі ўвайшоў у канцылярыю пан сэкрэтар—задыхаўшыся ды ўвесь чырвоны, як рак. Зьвярнуўся я да яго. „Poczekaj"—кажа „niemam czasu", — а сам сеў за стол ды давай „друкаваць" на пішучай машыне, ці, праўду кажучы, давай толькі дражніць людзей, якія пішуць на машыне; бо марудна яму ішла гэтая работа, марнаваў толькі час, ды псуў паперу. Пасьля паўгадзіннае „працы" пан сэкрэтар быў ужо мокры, як-бы з вады вылез — гэтак бядак замарыўся! Пасядзеў я яшчэ крыху, ды давай кашляць, даючы гэтым знаць аб сваей прысутнасьці. Адарваўся пан сэкрэтар ад свае працы, зірнуў перш на мяне, а пасьля на гадзіньнік, ды кажа: „Czego wy, ludzie, przeszkodzacie! Teraz już po godzinach urzędowych. Proszę wyjść!".

Выйшаў я дый пакіраваўся да хаты, але, адыйшоўшыся ад гміннага будынку, азірнуўся. Сэкрэтар сядзеў ужо на ганку зламыўшы ручкі на жывоціку дый... аддыхаў, каб на другі дзень усё зноў паўтарылася спачатку. **Д. М—сь.**

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

Гвалт над выбарамі да магістрату ў м. Скідлі.

(Горадзенскі павет).

Дня 17-га ліпня ў дзень выбараў да мястэчковага самаўраду ў м. Скідлі „przewodniczący" выбарамі скасаваў аб'яднаны сялянска-работніцкі сьпісак, у які ўвайшлі і беларусы. Зроблена гэта на тэй падставе, што пры ўкладаньні сьпіску, у рубрыцы, дзе павінна было быць — колькі гадоў — стаяла год нараджэньня. Вось якую знайшоў прычэпку „przewodniczący", ці як кажа „formalne niedokładności" — каб недапусьціць да самаўрадаў прадстаўнікоў пралетарыяту. Гэтаксама зрабіў і з сьпіскам жыдоўскім „Поалей-Сыона". Такім чынам асталося два сьпіскі — буржуазна польскі і буржуазна-нацыянальны жыдоўскі. Вось гэтыя дзьве групы бяз ніякіх выбараў дагаварыліся паміж сабой у тым сэньсе, што лішнія кандыдаты зракліся жаданьня быць выбранымі і выбары адбыліся без галасаваньня. Зрабіўшы толькі падзел паміж сабой мандатаў. Вось жа жыдам дасталося 8 мандатаў, палякам 2, прадажнаму беларусу 1, які ішоў пад польскім буржуазыйным сьцягам ды яшчэ 1 татарыну. Вось бачыце, працоўныя работнікі і сяляне, на якую ўгоду пайшла польская буржуазія, аддаючы сваім калегам жыдом большасьць мандатаў, абы толькі недапусьціць шчырых абаронцаў правоў працоўных да самаўрадаў, якія кіравалі-б мястэчковай гаспадаркай на карысьць працоўных.

Работніцка-сялянскі прадвыбарны камітэт не павінен абходзіць гэта маўчком, а павінен зложыць пратэст, да якога павінны далучыцца ўсе чэсныя сьвядомыя шырокія масы працоўных м. Скідля сваімі подпісамі. Памятайце, што буржуазія рабіла, робіць і будзе рабіць перашкоды на вашым шляху. Яна баіцца дапусьціць вас да самаўрадаў бо прадбачыць у гэтым сваю пагібель.

Дык пратэстуйце проці гвалту над выбарамі, грамадзяне! **Молат.**

Як адбыліся выбары ў Лашанскую гмінную Раду.

(Горадзенскі павет).

Дня 18-га ліпня адбыліся выбары ў Лашанскую гмінную Раду, Горадзенскага пав. На агульны лік 13 радных былі выбраны; 9 беларусаў і 4 палякі.

Выбары адбываліся ў прысутнасьці Горадзенскага старасты Банкевіча.

Молат.

Выбары ў гмінную Раду.

(Ляхавічы, Баранавіцкі павет).

У нядзелю 12-га чэрвеня неспадзявана былі абвешчаны выбары сяброў гміннага сабраньня для выбараў гміннае Рады. Сяляне, як і трэба было спадзявацца, на выбары пашлі сьвядома, выключаючы дзьве вёскі Шчаснавічы і засьц. Зубялевічы, бо першая выбрала да гміннага сабраньня польскага вучыцеля, другая асадніка. 18-га чэрвеня былі ўжо абвешчаны выбары ў гмінную Раду. Сялянскія прадстаўнікі зьвярнулі асаблівую ўвагу на тое, каб выставіць адзіны сялянскі сьпісак. Вяліся перагаворы і з мяшчанамі, але апошнія ад блёку адмовіліся і выставілі свой асобны № 7 сьпісак. Ня гледзячы на вялікія перашкоды, сяляне згаварыліся і выставілі свой сялянскі № 3 сьпісак, які атрымаў 7 мандатаў: № 1 (абшарнікі)—ніводнага; № 2 (ксяндзоўскі)—1 мандат; № 4 (асаднік)—1 мандат; № 5 (жыдоўскі) — 2 мандаты і № 6 — 1 мандат. Па нацыянальнасьці склад рады гэткі: беларусаў — 8, палякоў 2 і жыдоў 2.

Як мы спадзяваліся, што сялянскі сьпісак атрымае абсалютную большасьць, так яно і вышла. Маем цяпер надзею, што новая гмінная Рада ня пойдзе ў троп нябошчыцы старае Рады, а дружна возьмецца за працу і стане ў абарону правоў працоўнага люду і нашае роднае беларуск. культуры і школьніцтва. **Ю. В.**

Выбары.

(Сіняўка, Нясьвіжскі пав.).

Выбары ў нашай Сіняўскай гміне прайшлі досыць добра. У гмінную раду выбраны: 1 паляк, 1 жыд і 10 беларусаў, сярод якіх ёсьць два паўлюкевічаўцы Ярош і Шыбут. Паставілі іх у сьпісак апошнімі №№ толькі дзеля таго, каб не разьбіваць агульна-беларускага сьпіску. 4 ліпня адбыліся выбары войта. Пану Паўлюкевічу, відаць, вельмі хацелася, каб яго стаўленік Ярош быў войтам, бо аж навет сам прыехаў на выбары. Але нічога не памагло. Праваліўся. Войтам абралі Антося Мілішкевіча, які скончыў Віленскую Беларускую Гімназію і які стаіць і будзе стаяць у абароне інтарэсаў працоўнага народу. Яго заступнікам выбралі Янку Кажана. Такім чынам, тая гміна, на якую пан Паўлюкевіч пакладаў вялікія надзеі, якую ён заўсёды выстаўляў на першы плян, падвяла яго і правaліла ўсе яго стараньні і заходы. Можа хоць цяпер, пасьля такога вялікага носу, спыніць прысылку нам свайго „Б. Слова" (літару Б. чытай Бруднага) і перастане марочыць нам галовы. Бо гэта, пане Паўлюкевіч, лішняя праца, за вашым словам і за вамі ня пойдзем, а калі хто і йшоў калі-кольвек, дык цяпер апомніўся і каецца ў гэтым. Мінуліся тыя часы, калі вы вадзілі за нос нашае цёмнае сялянства. Досыць ужо баламутні. **Сіняўскі.**

І нас разбудзілі...

(м. Азёрніца, Чамерскае гм., Слонімшчына).

Нарэшце праснулася ад сну і наша Азёрніцкая моладзь, а разам з гэтым пачалося і новае жыцьцё, жыцьцё, якое дае надзею на лепшую будучыну, і навет на лепшую сучаснасьць. Гэтае лепшае ў сучаснасьці, мы ўжо цяпер адчуваем, бо каля рэстаранаў ціха, пустуюць—ня смокчуць больш нашае кішані; на вуліцы спакойна, бо няма бойнаў з суседняю Драпаўскаю моладзьдзю.

Усячына.

Як заселена зямля.

Паводле апошніх статыстычных дадзеных з 1925 году, на ўсей зямлі жыве 1864 мільёны людзей. 125 гадоў таму назад усіх людзей на зямлі было толькі 775 мільёнаў, а ў 1900 годзе 1564 мільёны. Етнолёг Мюльлер дзеліць усю людзкасьць на васемнаццаць групаў. З іх найбольшая група амэрыканска-эўрапэйская з 658 мільёнамі; за гэтай ідуць такія групы: усходня азіяцкая (576 мільёнаў), індыйская (317 мільёнаў), чорнаскурых (107 мільёнаў), усходняя (100 мільёнаў), малайская група (67 мільёнаў). Астальныя групы менш лічэбныя; найбольшыя з іх індыянская (14 мільёнаў), тунгуская (12 мільёнаў), мангольская (3.5 мільёнаў), армянская (2.9 мільёнаў). У перадзе амэрыканска-эўрапэйскай групы стаяць гэрманцы (гэрманскія народы), іх налічаецца да 250 мільёнаў; за імі ідуць романскія народы (207 мільёнаў) і ўрэшце славяне, якія лічаць 165 мільёнаў. З меншых падгруп лічаць іры 12 мільёнаў і вэнгры 10 мільёнаў.

За апошніх 125 гадоў найбольшы прырост выказвае малайская група, якая ўзрасла з 11.42 мільёнаў да 67 мільёнаў. Эўрапэйска-амэрыканская група ўзрасла за гэты час з 185 мільёнаў да 658 мільёнаў. Эўрапэйцы за гэты час павялічыліся лікам у чатыры разы, у той час як пазаэўрапэйскія народы гэтай групы павялічыліся ў 12 разоў.

АБВЕСТКА.

Ад Галоўнае Управы Т-ва Белар. Школы.

Гр. гр. вучыцялі Беларускіх гімназіяў паведамляюцца, што заняткі на курсах у Радашковічах для здабыцьця вучыцельскіх кваліфікацыяў пачнуцца ў аўторак 2 жніўня а 9 гадз. раніцы.

Просьба да ўсіх зьявіцца на курсы без спазьненьня.

Прэзыдыум Гал. Управы.

25. VII. 1927 г.

Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.